**Установа адукацыі**
**«Беларускі дзяржаўны педагагічны**
**ўніверсітэт імя Максіма танка»**

Факультэт беларускай і рускай філалогіі
Кафедра беларускай літаратуры і культуры

# “ЯК ПРОМЕНЬ СОНЕЧНЫ... ”: ВОБРАЗ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ У БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Курсавая работа
студэнта 21 групы
2 курса спецыяльнасці
«Беларуская мова і літаратура»
дзённай формы
атрымання адукацыі
__________Мялешкі
Яўгена Уладзіміравіча

Допушчана да абароны

Загадчык кафедры ______ ________

Пратакол №_____ад________2015 г.

Навуковы кіраўнік –
кандыдат філалагічных
навук, дацэнт
__________Н.В. Заяц

Абаронена ________________2015 г.
з адзнакай «____________________»

Мінск, 2015

**ЗМЕСТ**

УВОДЗІНЫ…………………………………………………………………….… 3

1 ГІСТАРЫЧНЫ ЖАНР У БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ …………………..5

2 АСОБА ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ У ГІСТОРЫІ………………….…….8

3 ВОБРАЗ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ У БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ… 13

ЗАКЛЮЧЭННЕ…………………………………………………………..…... 23

БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС……………………………………………..….......25

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# УВОДЗІНЫ

Даследчыкі слоўнага мастацтва неаднаразова адзначалі, што “кожная эпоха мае сваіх герояў, атаясамліваецца з пэўнымі легендарнымі ці гістарычнымі асобамі. У гісторыі Беларусі гэта Рагвалод і Рагнеда, Еўфрасіння Полацкая і Усяслаў Чарадзей, кароль Міндоўг і вялікі князь Альгерд. Аднак на працягу доўгага часу адлюстраванне каралёў, князёў і спосабаў духоўнага сану як персанажаў станоўчых было забаронена” [12, с. 8]. Аднак з цягам часу пункт погляду змяніўся і пісьменнікі сталі мець магчымасць паказваць сваіх “гістарычных” персанажаў не толькі як адмоўных, але і станоўчых.

Вядомы савецкі пісьменнік Аляксей Талстой, аўтар знакамітага гістарычнага рамана “Пётр I”, у свой час слушна зазначаў: “У кожным мастацкім творы – у тым ліку і ў гістарычным рамане, у гістарычнай аповесці – мы цэнім перш за ўсё фантазію аўтара, які ўзнаўляе па абрыўках дакументаў, што дайшлі да нас, жывую карціну эпохі і асэнсоўвае гэту эпоху. У гэтым карэннае адрозненне мастака ад гісторыка і даследчыка” [Цыт. па: 11, с. 7]. А далей ён даводзіў, што аўтар гістарычных твораў усё ж павінен улічваць спецыфіку жанру. “Вы пытаецеся – ці можна “прасачыць” біяграфію гістарычнай асобы. Можна. Але зрабіць гэта так, каб… гэта (прыдуманае) калі і не было, то павінна было быць” [Цыт. па: 11, с. 7].

Сапраўды, пісьменнік, як і гісторык, “узнаўляе ў сваіх творах падзеі і рэчы мінуўшчыны, хоць гэтае ўзнаўленне адрозніваецца ад навуковага. Абапіраючыся на дадзеныя гістарычнай навукі, пісьменнік заўсёды ідзе па шляху творчага вымыслу, без якога немагчыма стварыць па-сапраўднаму мастацкі твор. Аднак вымысел патрабуе, каб прыдуманыя сітуацыі былі матываванымі, а апісанне падзей і асобаў мінуўшчыны, побыту эпохі абапіраліся на факты гістарычных крыніц, на пэўныя навуковыя канцэпцыі, бо лёсы людзей існуюць у гісторыі і гісторыяй, дадзенымі спрадвеку законамі вызначаюцца беды і радасці, поспехі і скрухі кожнага з нас, кожнага тленнага і часовага чалавечага жыцця.

Ствараючы вобраз гістарычнага героя, пісьменнік спрабуе пазнаць яго ўнутраны свет. Імкненне пранікнуць у яго патаемны свет вядзе да раскрыцця ўласнага светабачання творцы. Не сакрэт, што ў кожнага аўтара, як і ў кожнага чалавека, сваё, часам унікальнае, непаўторнае ўспрыманне навакольнага [10].

**Мэта** – даследаваць асаблівасці мастацкага ўвасаблення вобраза Еўфрасінні Полацкай рознымі пісьменнікамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Задачы:**

1) даследаваць спецыфіку гістарычнага жанру ў беларускай літаратуры;
2) прааналізаваць літаратурна-мастацкія творы, дзе прадстаўлены вобраз Еўфрасінні Полацкай;
3) вызначыць суадносіны гістарычнай праўды і мастацкага вымыслу ў раскрыцці вобраза Еўфрасінні Полацкай у літаратурных творах.

**Аб’ектам** даследавання выступаюць літаратурна-мастацкія творы і гістарычныя дакументы, у якіх знайшоў увасабленне вобраз Еўфрасінні Полацкай (“Жыціе Еўфрасінні Полацкай”, аповесць В. Іпатавай “Прадыслава”, эсэ У. Арлова “Еўфрасіння”, п’еса А. Петрашкевіча “Крыж святой Еўфрасінні”, п’есы А. Дударав “Палачанка” і “Крыж”, паэма Д. Бічэль-Загнетавай “Еўфрасіння Полацкая”, вершы Л. Рублеўскай, Г. Булыкі, А. Лойкі, А. Звонака і інш.).

**Прадмет** даследавання – спосабы стварэння вобразаў рэальных гістарычных асоб у навуцы і літаратуры.

Курсавая работа складаецца з уводзінаў, трох параграфаў (“Гістарычны жанр у беларускай літаратуры”, “Асоба Еўфрасінні Полацкай у гісторыі”, “Вобраз Еўфрасінні Полацкай у беларускай літаратуры”), заключэння і бібліяграфічнага спіса.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

У працы разгледжаны мастацкія творы, прысвечаныя Еўфрасінні Полацкай. На аснове праведзенага даследавання можна зрабіць наступныя вывады:

1. Гістарычны жанр, папулярызаваны і дасканала распрацаваны ў свой час Уладзімірам Караткевічам, у беларускай літаратуры займае асобнае месца. Гістарычная тэматыка прыцягвае ўвагу творцаў, якія працуюць у розных літаратурных родах і жанрах (авовесць, эсэ, п’еса, паэма, лірычны верш і інш.). Усё часцей з’яўляюцца творы на тэму далёкага мінулага, прысвечаныя слаўным падзеям і людзям беларускай зямлі.
2. Вобраз першай полацкай князёўны займае пачэснае месца сярод іншых вобразаў літаратуры. Ёй прысвечаны многія творы, дзе прадстаўлены як сапраўдныя гістарычныя факты, так і мастацкі вымысел, плён пісьменніцкай фантазіі.
3. Пра жыццё і дзейнасць Еўфрасінні Полацкай напісана шмат мастацкіх твораў. Галоўнай крыніцай звестак пра святую выступае “Жыціе Еўфрасінні Полацкай”, у якім асветніца паказваецца як знакавая постаць беларускай культуры. У “Жыціі...” прысутнічаюць канкрэтныя звесткі пра Еўфрасінню. Помнік створаны паводле канонаў агіяграфічнага жанру, вобраз Еўфрасінні ў ім вельмі ідэалізаваны і мала індывідуалізаваны нягледзячы на тое, што ў творы прысутнічаюць пэўныя бытавыя рэаліі і біяграфічныя факты.
4. Многіх сучасных аўтараў прыцягвае постаць святой Еўфрасінні. Ёй прысвечаны паэма Дануты Бічэль-Загнедавай “Еўфрасіння Полацкая”, п’еса Аляксея Дударава “Крыж”, аповесць Вольгі Іпатавай “Прадыслава”, балада Людмілы Рублеўскай “Еўфрасіння” і інш.
5. У розных творах вобраз Еўфрасінні Полацкай падаецца па рознаму, яе вобраз прадстаўлены ў выглядзе двух канцэптуальных асноўных падыходаў: з аднаго боку, Еўфрасіння выступае як асветніца, падзвіжніца, неардынарная асоба з нялёгкім, незвычайным лёсам, як сімвал жыцця і духоўнасці ўсіх беларусаў. З другога боку, аўтары ўносяць у яе вобраз натуралістычныя рысы звычайнай жанчыны, якая ўсе жыццё перамагае ў сабе першародныя пачаткі дзеля спасціжэння вышэйшай Боскай святаці і духоўнасці. Вобраз Еўфрасінні Полацкай кожны пісьменнік прадстаўляе са свайго ўласнага пункта погляду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

6. Вобраз Еўфрасінні Полацкай сустракаецца ва ўсіх жанрах літаратуры, асабліва ён распаўсюджаны ў так званай жаночай паэзіі. Многія жанчыны-пісьменніцы нібы прымерваюць на сябе лёс Еўфрасінні, спрабуюць зразумець зроблены ёю выбар.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС


1. Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы; навук. рэд.: В. А. Чамярыцкі. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – 1015 с.
2. Арлоў, У. ЕўфрасіннproblemПолацкая / У. Арлоў. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 220 с.
3. Арлоў, У. Асветніца з роду Усяслава / У. Арлоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 56 с.
4. Бічэль-Загнетава, Д. Еўфрасіння Полацкая : вершы // Беларусь. – 1988. – № 1.
5. Воюш, І. «Я – вясна непаўторная!..» : вобраз Еўфрасінні Полацкай у беларускай літаратуры / І. Воюш // Роднае слова. – 2001. – № 1. – С. 32–35.
6. Дамарад, І. «Князёўнай полацкаю пачаты…» : аповесць “Прадыслава” Вольгі Іпатавай / І. Дамарад // Роднае слова. – 2004. – № 8. – С. 8–11.
7. Дамарад, І.І. Ля вытокаў гістарызму / І.І. Дамарад // Веснік БДУ. – 2002. – № 1. – С. 78–80.
8. Дамарад, І.І. Прататып і вымысел: гістарычныя апавяданні Вольгі Іпатавай / І.І. Дамарад // Роднае слова. – 2002. – № 2. – С. 9–11.
9. Драбеня, Ф. Асэнсаванне гісторыі народа ў драмах Алеся Петрашкевіча / Ф. Драбеня // Роднае слова. – 2009. – 7. – С. 35–37.
10. Марціновіч, А. Святая Еўфрасіння, або Адкуль ёсць, пайшла Полацкая зямля / А. Марціновіч. – Мінск : Беларусь, 2009. – 111 с.
11. Тарасаў, К. Падзеі гісторыі і версіі літаратуры / К. Тарасаў // Полымя. – 1988. – № 2. – С. 195–204.
12. Чыгрынаў, І. Звон – не малітва : п’есы / І. Чыгрынаў. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 398 с.
13. Шынкарэнка, В.К. Нястомных пошукаў дарога: праблемы паэтыкі сучаснай беларускай гістарычнай прозы / В.К. Шынкарэнка. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – 208 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ